# Дарогі класіка...

Сёння спаўняецца 130 гадоў з дня нараджэння народнага песняра Беларусі Якуба Коласа. Юбілею Канстанціна Міхайлавіча даводзіцца быць апошнім у чарадзе гучных сёлетніх літаратурных юбілеяў, але гэта не замінае яму быць, бадай, самым маштабным і разложыстым, як той наднёманскі коласаўскі дуб. Не злічыць тых канцэртаў, выстаў, сустрэч, прысвечаных Коласу, якія праходзяць у гэтыя юбілейныя дні па ўсёй краіне. Кульмінацыяй жа свята стаў выхад апошняга 20-га тома новага Збору твораў класіка ў 20 тамах з навуковымі каментарыямі... А яшчэ ўчора пачаў сваю работу XIX Мінскі міжнародны кінафестываль "Лістапад". Пра ўсё гэта чытайце ў сённяшнім культуралагічным дадатку "Рэй".

Рэй

Субота, 3 лістапада 2012 года

Культуралагічны дадатак да "Настаўніцкай газеты"



Антон Баранаў. "Да Коласа", лічбавая графіка, 2012 г. Гэтая работа нядаўна экспанавалася ў Палацы мастацтва на Рэспубліканскай мастацкай выставе, прысвечанай 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

*Дарогі, вечныя дарогі!*
*Знаць, вам спрадвеку самі богі,*
*Калі красёнцы жыцця ткалі,*
*І вашы лёсы вызначалі,*
*Няма канца вам, ні супыну;*
*Вы жывы кожную часіну,*
*То задуменны, смутна строгі,*
*Як след захованай трывогі,*
*То поўны чараў спадзявання,*
*То страхаў цёмнага знікання,*
*Калі душа свой лёс прачуе,*
*І ноч нябыту зацяўюе...*
*Дарогі, цёмныя дарогі!*
*Вы так маўклівы, вы так строгі!*
*Хто вас аблічыць? Хто вас змерыць?*
*Хто вашы звівы ўсе праверыць?*
*Хто вашы ходы абшукае?*
*Бо ўсё сваю дарогу мае!*

*(Якуб Колас. Пачатак раздзела "Па дарозе ў Вільню" паэмы "Новая зямля".)*

# Дарогі класіка...

## Сёння спаўняецца 130 гадоў з дня нараджэння народнага песняра Беларусі Якуба Коласа

130-годдзю Якуба Коласа даводзіцца быць апошнім у чарадзе гучных сёлетніх літаратурных юбілеяў. Што, зрэшты, зусім не замінае коласаўскаму юбілею быць, бадай, самым маштабным і, так бы мовіць, самым разложыстым, як той нанёманскі дуб, пра які Канстанцін Міхайлавіч пісаў: “Сілачом стаіць // Дуб разложысты, // І здалёк відаць // Пышны верх яго”.

Іх вельмі шмат, коласавых дарог, у Беларусі і не толькі ў нашай краіне. А таму і святкуюць або адсвяткавалі ўжо юбілей класіка так шырока: і на яго малой радзіме на Стаўбцоўшчыне, дзе на мінулым тыдні ў мемарыяльных сядзібах, філіялах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа адгрымела рэспубліканскае свята паэзіі “О, Беларусь, ты сэрца і душа”; і на Пухавічыне, дзе любіў летаваць дзядзька Якуб; і ў Віцебску, дзе яго імя пачэсна носіць акадэмічны драматычны тэатр; і на Палессі, якое адыграла вызначальную ролю ў этнаграфіі і тапаніміцы Коласавай прозы; і, безумоўна, у Мінску, дзе ён, уласна кажучы, напоўніцу і рэалізаваўся як творца, грамадзянін і чалавек і дзе знайшоў свой вечны прытулак...

Цягам усяго гэтага года Мінск, безумоўна, быў эпіцэнтрам усіх мерапрыемстваў, прысвечаных 130-годдзю народнага песняра. Не злічыць тых выстаў, якія ладзіліся ў музеях і галерэях сталіцы (адзін толькі Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа арганізаваў іх некалькі дзясяткаў), тых літаратурных сустрэч і навукова-практычных канферэнцый, якія праводзіліся ў бібліятэках ды адукацыйных, навуковых і музейных установах, тых вялікіх і дробных акцый кшталту конкурсаў сачыненняў і конкурсаў чытальнікаў, якія праходзілі або непасрэдна ў гонар Коласа, або з ледзь прыхаванай думкай пра яго і яго спадчыну. Парадавалі і аўтары ды выдавецтвы цэлым россыпам новых навуковых, мемуарных і мастацкіх выданняў, прысвечаных народнаму паэту, а найперш завяршэннем выдання навукова каментаванага Збору твораў класіка ў 20 тамах.

Гэтымі днямі адбываецца кульмінацыя ўсіх юбілейных урачыстасцей. Сёння да падножжа помніка народнаму песняру на плошчы яго імя ў сталіцы будуць ускладзены сотні букетаў ад удзячных нашчадкаў. Учора з поспехам прайшла XXVII Міжнародная канферэнцыя “Якуб Колас. Чалавек. Эпоха. Час”. А яшчэ за два дні да канферэнцыі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі была зладжана літаратурна-асветніцкая акцыя “Народны настаўнік”, у рамках якой былі прэзентаваны аднайменная кніжная выстава і віртуальны праект “Класікі сусветнай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас”. Вось бачыце, нашы дарагія класікі, цяпер вашы дарогі не цёмныя і не смутна строгія, але што праўда, то праўда: у інтэрнэце хто вашы звівы ўсе праверыць, хто вашы ходы абшукае? Як праўда і тое, што дарога класіка — гэта заўсёды правераная жыццём дарога.

►►► 11 стар.

# Дарогі класіка...

◄◄◄ 9 стар.

Адкрываючы літаратурна-асветніцкую акцыю "Народны настаўнік", першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алена Даўгаполава паведаміла, што ў галоўнай скарбніцы краіны сёння вядзецца актыўная работа па пераводзе каштоўных друкаваных і рукапісных матэрыялаў са спадчыны нашых класікаў, якія захоўваюцца ў НББ, у лічбавую форму. Яна ж нагадала, што менавіта Якубу Коласу пяць гадоў назад была прысвечана першая віртуальная выстава, якую стварылі супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, і сёлетні віртуальны праект "Класікі сусветнай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас. Да 130-годдзя з дня нараджэння" (www.nlb.by) стаў лагічным працягам той ініцыятывы па папулярызацыі спадчыны нашых класікаў.



Выступае дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, філіяла ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры" Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Аляксандр Лукашанец.

Падчас мерапрыемства таксама выступіў дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, філіяла ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры" Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Аляксандр Лукашанец, які звярнуў асаблівую ўвагу прысутных на ўклад народнага песняра ў развіццё новай беларускай літаратурнай мовы. Супрацоўнікі інстытута склалі рукапіс слоўніка мовы твораў Якуба Коласа і ўнікальную картатэку сакавітых коласаўскіх слоў, якія немагчыма знайсці ў вядомых тлумачальных слоўніках. Загадчык аддзела выданняў і тэксталогіі ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры" НАН Беларусі Тэрэза Голуб прэзентавала новы Збор твораў класіка ў 20 тамах (інтэрв'ю з Тэрэзай Станіславаўнай чытайце на наступных старонках).



Галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа праўнучка народнага песняра Васіліна Міцкевіч запрасіла ўсіх на юбілейную выставу ў музей паэта, дзе прадстаўлены рэдкія матэрыялы з яго асабістага архіва на тэму "Як Якуб Колас святкаваў свае дні нараджэння". У прыватнасці, у экспазіцыі можна ўбачыць лісты і паштоўкі да Якуба Коласа з віншаваннямі ад яго родных і знаёмых, вядомых дзяржаўных дзеячаў і дыпламатаў, калег-пісьменнікаў і акадэмікаў. Цікава, дарэчы, што апошнія таксама намагаліся надаць сваім віншаванням, няхай не заўсёды зграбную, але ўсё ж такі паэтычную форму. Тут жа ўвазе наведвальнікаў прапаноўваюцца кнігі з дарчымі подпісамі, матэрыяльныя падарункі і, безумоўна, лісты народнага песняра ў адказ сваім прыхільнікам.

Акрамя таго, Васіліна Міцкевіч паведаміла, што ў музеі паэта, па сутнасці, падрыхтаваны энцыклапедычны даведнік "Асобы з акружэння Якуба Коласа", які, магчыма, выйдзе ўжо сёлета. А яшчэ ў найбліжэйшых планах коласаўцаў — выданне мультымедыйнага дыска па паэме "Новая зямля".

Напрыканцы мерапрыемства супрацоўнікі інфармацыйна-аналітычнага аддзела па культуры і мастацтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, як і абяцалі, прэзентавалі свой віртуальны праект "Класікі сусветнай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас. Да 130-годдзя з дня нараджэння", пра што варта расказаць падрабязней.



На юбілейнай кніжнай выставе ў НББ – кнігі, кнігі, кнігі... І ўсе яны належаць пяру аднаго чалавека – народнага песняра Якуба Коласа.

Гэты рэсурс быў створаны найперш для таго, каб забяспечыць аддаленым карыстальнікам доступ да поўных тэкстаў першакрыніц: першых твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа, змешчаных у перыядычным друку, першых кніг аўтараў, некаторых асобных выданняў іх твораў, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Для гэтага супрацоўнікамі НББ было алічбавана больш за 100 кніг Янкі Купалы і Якуба Коласа (паэтычныя зборнікі, паэмы, зборнікі апавяданняў, аповесці, п'есы, зборнікі твораў для дзяцей, кнігі з перакладамі, першыя зборы твораў, асобныя творы), што складае каля 30 тысяч старонак тэкставага матэрыялу. Акрамя таго, праект дазваляе карыстальніку скласці поўнае ўяўленне пра асобу і жыццядзейнасць Якуба Коласа і Янкі Купалы, асаблівасці мастацкага метаду кожнага з класікаў, іх уплыў на грамадства і беларускую культуру (музыку, выяўленчае мастацтва, тэатр), прысутнасць у віртуальнай беларуска-, руска- і англамоўнай прасторы.



Нашчадкі класіка – праўнучка Канстанціна Міхайлавіча галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Васіліна Міцкевіч і ўнучка народнага паэта супрацоўніца Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вера Міцкевіч.

Так, у першым раздзеле рэсурсу "Янка Купала і Якуб Колас: сучаснікі, паплечнікі, аднагодкі" аналізуюцца творчыя стылі класікаў, параўноўваюцца мадэлі створаных імі літаратурных сусветаў, прасочваюцца кропкі іх судакранання. У прыватнасці, там адзначаецца: "Паэтычны свет Янкі Купалы — перш за ўсё прадукт яго творчай фантазіі. Янка Купала — мастак-творца, стваральнік вобразаў, у якіх рэальнасць ператваралася ў дзівоснасць рамантычнай красы. Купала таму менш за ўсё быў аўтабіяграфічны. У ім канцэнтравалася найперш духоўнае... Якуб Колас — мастак перш за ўсё біяграфічны, яго творчасць — малюнкі, ім бачаныя, узрушэнні, ім перажытыя, паэтызацыя лёсу свайго ці людзей, блізкіх паэту, знаёмых; свет, асабіста ім бачаны і пачуты. Колас стварыў цэлы шэраг твораў рамантычнага характару. Але рамантычны свет Коласа — гэта свет не фантастычна-ўмоўных вобразаў, як звычайна ў Купалы, а выяўлены ў дакладных рэаліях і дэталях. Якуб Колас больш эпічны, больш зямны, чым Купала; ён надзвычай уважлівы да побыту людзей працы, іх штодзённых клопатаў, да асобных людскіх лёсаў...".

Змест другога раздзела "Янка Купала і Якуб Колас: летапіс жыцця і творчасці" прынцыпова пададзены ў выглядзе табліцы: злева ў храналагічным парадку прасочваюцца падзеі ў жыцці Івана Дамінікавіча, справа — такім жа чынам падзеі ў жыцці Канстанціна Міхайлавіча. Карыстальнік атрымлівае выдатную магчымасць параўнаць біяграфіі двух творцаў, суаднесці тое, што адбывалася ў жыцці аднаго песняра, з тым, што было непасрэдна ў гэты ж час з другім. Гэта тычыцца і першых публікацый, і выхадаў асобных зборнікаў, і тэатральных пастановак, і ўдзелу ў грамадскім ды палітычным жыцці і г.д.

Раздзел "Чытаем Купалу і Коласа разам" можна лічыць асноўным. Напрыклад, што тычыцца Коласа, у фармаце PDF тут падаюцца тэксты першых твораў паэта, надрукаваных у газетах "Наша доля" і "Наша ніва", а таксама "Другога чытання для дзяцей беларусаў" (1909) і зборніка "Песні жальбы" (1910). Тэксты твораў пазнейшых перыядаў размешчаны па рубрыках: "Беларускі народ у творах Якуба Коласа", "Вялікая Айчынная вайна ў творчасці Якуба Коласа", "Творы Якуба Коласа, прысвечаныя жанчыне, маці, каханню", "Тэма любові да роднай мовы ў творчасці Якуба Коласа" і інш. Тут жа змешчаны і ёмкія літаратуразнаўчыя артыкулы.

Для раздзела "Слухаем Купалу і Коласа" алічбаваны гуказапісы з галасамі народных пісьменнікаў Беларусі і гуказапісы іх асобных твораў у выкананні вядомых акцёраў. У прыватнасці, мы можам пачуць урывак верша Якуба Коласа "Савецкія дні" ў выкананні самога песняра і ўрывак з яго выступлення на вечары, прысвечаным яго 70-годдзю. З вядомых артыстаў Коласа дэкламуюць Генадзь Аўсяннікаў, Віктар Манаеў, Віктар Тарасаў і Марыя Захарэвіч.

У раздзеле "Спяваем песні і рамансы на словы класікаў" прадстаўлены музычныя творы на словы аўтараў, розныя па жанрах, змесце, тэматыцы, выканальніцкай манеры. Сярод выканаўцаў — народная артыстка Беларусі і СССР Ларыса Александроўская, ансамблі "Песняры" і "Сябры", Віктар Шалкевіч і іншыя.

У галерэі "Мастакі-ілюстратары твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа" сабраны лепшыя высокамастацкія ўзоры кніжнай графікі, створаныя беларускімі мастакамі, якія афармлялі кнігі класікаў.

У цэлым жа мастацтва кніжнага афармлення твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа прадстаўлена ў гэтым раздзеле імёнамі звыш 50 беларускіх мастакоў.

Раздзел "Выслоўі, выказванні, афарызмы беларускіх песняроў" — гэта 127 літаратурных ідыём, размешчаных па 21 тэматычнай рубрыцы: "Гонар, годнасць чалавека, народа"; "Доля, лёс чалавека, грамадства, прадвызначанасць жыццёвага шляху"; "Шчасце, каханне, вера, вернасць, любоў"; "Жанчына — жонка, жанчына — маці, яе роля ў сям'і, у грамадстве"; "Дзяцінства, вучоба і выхаванне маладога пакалення, веды і вопыт, асоба настаўніка, выхавальніка"; "Чалавек, яго існасць, вартасць, значнасць, месца на зямлі", "Памяць чалавека, памяць пакаленняў", "Мінулае, спадчыннасць і спадчына" і інш. Гэты раздзел асабліва ярка сведчыць пра выразнасць, вобразнасць і багацце мовы народных пісьменнікаў, усебаковасць іх інтарэсаў, захапленне роднай прыродай, патрыятызм.

Нарэшце, у раздзеле "Купала і Колас у прасторы інтэрнэту" можна знайсці вялікае мноства спасылак на іншыя рэсурсы з інфармацыяй пра нашых класікаў і іх тэкстамі, у тым ліку на рускай і англійскай мовах.

Дарогі, вечныя дарогі!

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота аўтара і Алега ІГНАТОВІЧА.**